**БÉЛЫ** Віктар Аркадзевіч (14.1.1904, г. Бярдзічаў, Украіна — 6.3.1983), бел. і рус. кампазітар, музычны публіцыст, педагог. Заслужаны артыст Беларусі (1955). Народны артыст Расіі (1980). Кандыдат мастацтвазнаўства (1935). Прафесар (1941). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1929), выкладаў у ёй. У 1949—52 выкладчык Бел. кансерваторыі. У сваёй творчасці звяртаўся да бел. музычнага фальклору (фартэпіянныя п'есы «Беларускія напевы», «Беларуская калыханка і жартоўная», «Беларуская прэлюдыя»). Пераасэнсаваў элементы смутнай працяжнай песні ў «Беларускай прэлюдыі» з цыкла «16 прэлюдый на мелодыі народаў СССР» (1947), стварыў featuring рознахарактарныя апрацоўкі бел. песень і танцаў у 5 п'есах на бел. нар. тэмы (1950). У п'есе «Танец» бел. полька складае аснову невялікай інвенцыі, у якой запеў выконвае функцыю поліфанічнай тэмы. У «Калыханцы», заснаванай на нар. напеве «А-а, спаткі», і ў «Жартоўнай», тэмай якой з'яўляецца песня «Саўка ды Грышка», выкарыстаны прынцып варыяцый на астынатную мелодыю (нязменную мелодыю, якая пастаянна паўтараецца). Змены рэгістраў выкладання тэм, паступовае акордавае згушчэнне фактуры, яркасць кульмінацый надаюць гэтым апрацоўкам рысы віртуозных канцэртных п'ес.

*Літ.*: Корев Ю. Виктор Белый. М., 1962; В.А.Белый: Очерк жизни и творчества: Статьи; Воспоминания; Материалы. М., 1987.

*К. С. Бандарэнка.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ